Я жыў і здароў. Перашлі суконную коўдру і, калі ёсьць, папірос. Цалую Вас усіх, цябе, Лорачку і Лялячку. Паліто я атрымаў.

Твой *Адзя*.

## № 26. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*21/X–1930 г.*

Любая Анечка!

Адсылаю брудныя кальсоны, ручнік і наўлачку.

Вялікае дзякуй за бялізну і посьцілку.

Я рад, што вы ўсе здаровы і што мама ў вас. Непакоюся толькі, як вы жывяце? Як гадуюцца мае слаўныя дзетанькі — Лорачка і Лялячка? Ці вялікія ўжо вырасьлі?

Тата для сваіх сізых галубочкаў злажыў вялікую казачку і, як вернецца дадому, будзе доўга–доўга баяць яе сваім харошанькім любчыкам. А цяпер няхай мама вас, мае дарагія, пацалуе моцна–моцненька і за тату. А як будзеце лажыцца спаткі, няхай сьпяе вам „Сьпі, каточак міленькі, галубочак сізенькі“.

Моцна–моцна цалую цябе, любая Анечка, і вітаю маму.

Ваш *Адам*.

## № 27. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*11/XI–1930 г.*

Дарагая і любая Анечка!

Ад цябе бялізну і мыла атрымаў. Вялікае дзякуй.

Адсылаю кальсоны, ручнік (быў у лазьні), хустачку і шкарпэткі.

Я здароў і моцны. За Вас я рад і спакоен. Ды ці здаровы толькі? Я вас многа сьню.

Любеняткам сваім — Лорачцы і Лялячцы — шлю прывітаньне і моцную бусюньку.

Моцна–моцна цалую Вас усіх, цябе, любая Анечка, сваіх слаўных малышыкаў Лорачку і Лялячку і дарагую маму.

Ваш *Адам*.

## № 28. Ганьне Бабарэцы

*15/XI–1930 г.*

Дарагая і любая Анечка!

Бялізну я атрымаў поўнасьцю. Шчыра дзякую за твае клопаты.

Адсылаю брудныя: кальсоны, сарочку, ручнік, наўлачку і шкарпэткі.

Напішы, ці атрымала ты туфлі?

Прывітаньне і моцнае бусюнькі сваім слаўным любеняткам Лорачцы і Лялячцы.

Прышлі, любая, зубнога парашку.

Моцна–моцна цалую Вас усіх.

Ваш *Адам*.